УДК 908:821.161.3 (476)



**Д.Ю. КІСЕЛЬ**
загадчык лабараторыі «Бізнэс-цэнтр»
Палескі дзяржаўны ўніверсітэт,
г.Пінск, Рэспубліка Беларусь

*Статья поступила 7.04.2026 г.*

# РОЛЯ ПІНСКАГА КРАЮ Ў ЛЁСЕ ЯКУБА КОЛАСА: СТАНАЎЛЕННЕ ГРАМАДЗЯНІНА І ПАЭТА[1]

*У артыкуле на аснове архіўных і апублікаваных крыніц разгледжаны перыяд сацыякультурнай дзейнасці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа на пачатку XX стагоддзя ў в. Пінкавічы Пінскага раёна і г. Пінску – адміністратыўна-палітычным, эканамічным і культурным цэнтры самабытнага рэгіёна Беларусі – гістарычнай Піншчыны. Аўтарам зроблена спроба сістэматызаваць старонкі біяграфіі Коласа звязаныя з Пінскім краем і прааналізаваць уплыў рэгіёна на яго фармаванне, як грамадзяніна і паэта.*

***Ключавыя словы:*** *пінчукі, Пінскае Палессе, мастацкія творы, Пінкавічы, народнае вучылішча, Пінск, народны паэт.*

**KISEL D.Yu.,** Head of Laboratory «Business Center»
Polessky State University, Pinsk, Republic of Belarus

# THE ROLE OF THE PINSK REGION IN THE LIFE OF YAKUB KOLAS: FORMATION OF THE CITIZEN AND THE POET

*Based on archival and published sources, the article examines the period of socio-cultural activity of the People's Poet of Belarus, Yakub Kolas, in the early 20th century in the village of Pinkavichy (Pinsk district) and the city of Pinsk — the administrative, political, economic, and cultural center of a distinctive region of Belarus, the historical Pinshchyna. The author attempts to systematize the biographical accounts of Kolas related to the Pinsk region and analyzes the impact of the region on his formation as both a citizen and a poet.*

***Keywords:*** *Pinchuki, Pinsk Polesie, literary works, Pinkavichy, public school, Pinsk, People's Poet.*

[1] Публикуется в авторской редакции

**Уводзіны.** Постаць Якуба Коласа ў нацыянальным пантэоне займае важнае месца, калі не сказаць, што адно з цэнтральных. Класік беларускай літаратуры, адзін з яе заснавальнікаў, чые імя з'яўляецца часткай падмурка беларускай дзяржаўнасці. Гэта постаць, якая аб'ядноўвае беларусаў, умацоўвае нацыянальны стрыжань. Таму вельмі важна дэталёва, ўсебакова вывучаць старонкі біяграфіі народнага паэта. Перыяд яго жыцця і дзейнасці на пачатку XX стагоддзя на Піншчыне, ў вёсцы Пінкавічы і горадзе Пінску, на жаль, дагэтуль не з'яўляецца дасканальна даследваным і сістэматызаваным. Хаця за апошнія паўстагоддзя зроблены істотны прарыў – ад сухой інфармацыі пра тое, што ў пэўныя гады Якуб Колас настаўнічаў на Піншчыне да апісання яго жыцця на пінскай зямлі.

Згадкі пра Пінкавічы і Пінск у лёсе Якуба Коласа пачалі з'яўляцца па меры таго, як адбывалася ўшанаванне імя класіка беларускай літаратуры ў мясцінах звязаных з яго творчым і жыццёвым шляхам.

Асаблівая ўвага была нададзена ў 1952 годзе, з нагоды 70-годдзя пісьменніка і ў 1956 годзе, ў сувязі са смерцю мастака слова. Так, у кастрычніку 1952 года Вярхоўны Савет БССР выдаў указ [1], дзе ў тым ліку гаварылася пра неабходнасць прысвоіць імя класіка Пінкавіцкай сярэдняй школе. Займаючыся рэалізацыяй указа старшы інспектар па ахове помнікаў гісторыі і культуры Пінскага абласнога выканаўчага камітэта Б.В. Міралюбаў заўважыў [2], што няма ніякіх дакументальных доказаў працы Коласа на Піншчыне, а ў некаторых біяграфічных даведках ёсць разыходжанні ў гадах. Таму Міралюбаў напісаў пісьмо да Коласа, каб той сам удакладніў і пацвердзіў. У выніку народны паэт адказаў, што сапраўды ў 1904–1906 гадах настаўнічаў у Пінкавічах, а ў 1912–1915 гадах жыў і працаваў у Пінску.

Улічваючы гэты факт у 1958 годзе Пінскі краязнаўчы музей выдаў зборнік матэрыялаў для краязнаўцаў-вандроўнікаў па родным краі «В поход по Пинщине» [3]. Укладальнікі, супрацоўнікі музея А.І. Лазіцкі, Ф.Ф. Жураўскі, У.У. Баравікоў згадалі ў зборніку пра сувязь Коласа з пінскім рэгіёнам у адпаведнасці з ідэалагічнымі ўстаноўкамі таго часу «С дореволюционной Пинщиной, с борьбой трудящихся масс против угнетателей связано формирование мировоззрения, жизненного и творческого пути классика белорусской литературы Якуба Коласа. Работая здесь учителем […], поэт собрал богатый материал для своей трилогии «У палесскай глушы», «У глыбі Палесся», «На ростанях»» [3, с. 17]. Гэта адно з першых выданняў, ва ўсялякім выпадку на Піншчыне, дзе не толькі ўзгадваецца сам факт настаўніцтва паэта на Піншчыне, але і даецца каментар пра ўплыў края на яго творчасць і ўдзел паэта ў грамадска-палітычным жыцці.

Сапраўды грунтоўную працу па даследванню жыцця Якуба Коласа ў Пінкавічах і Пінску зрабіў І.І. Калоша, які ў выніку ініцыяваў стварэнне школьнага, а затым літаратурна-краязнаўчага музея ў гонар Песняра ў в.Пінкавічы [4, с. 102-104]. Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Пінкавіцкай школы ў 1960–1990 гадах рупліва, разам з зацікаўленымі вучнямі і неабыякавымі калегамі, збіраў інфармацыю па знаходжанні паэта на Піншчыне [5]. Калоша адшукаў і зрабіў аўдыё запісы коласаўскіх вучняў з Пінкавіч [6], мясцовых жыхароў, якія мелі кантакт з пісьменнікам. Высветліў, якім быў побыт Коласа ў Пінкавічах, якая яго роля ў шматгадовым супрацьстаянні паміж мясцовымі сялянамі і памешчыкам Сігізмундам Скірмунтам і г.д.. Маючы назапашаны багаты матэрыял, пры жыцці І.І. Калоша падрыхтаваў рукапісы варыянт кнігі, але выданне пабачыла свет ужо пасля смерці аўтара. У кнізе «Пінкавічы і Вішавічы: мінулае і сучаснае» [7] апісаны важнейшыя падзеі гэтых вёсак, у тым ліку і прыбыццё народнага паэта.

У сярэдзіне 2000-х гадоў пінкавіцкім і пінскім перыядам Якуба Коласа зацікавіўся даследчык, краязнаўца А.І. Ільін [8]. Зробленая ім праца, бадай што пасля І.І. Калошы, стала другім грунтоўным вывучэннем знаходжання народнага паэта на Піншчыне. Ільін, дзякуючы шматгадоваму збору інфармацыі ў айчынных і замежных архівах, выявіў блізкае атачэнне Коласа ў Пінску, з кім меў прыязныя адносіны [8, с.

135]. Выявіў, дзе знаходзіліся вучылішчы ў якіх працаваў Колас у Пінску. Удакладніў, у якой царкве адбылося вянчанне паэта з настаўніцай М.Д. Каменскай, якія творы пісьменнік напісаў знаходзячыся ў Пінску і над якімі пачаў працаваць.

**Асноўная частка.** У 1904–1906 гадах малады настаўнік Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч (Якуб Колас) выкладаў у народным вучылішчы ў вёсцы Пінкавічы Пінскага павета Мінскай губерні. Гэты перыяд займае важнае месца ў яго жыццёвым і творчым шляху. Тут пачалося ягонае станаўленне, тут ён удасканальваў сваё педагагічнае майстэрства, фарміраваўся яго светапогляд годнага грамадзяніна сваёй Бацькаўшчыны. І гэта не выпадкова, бо Якуб Колас прыехаў працаваць настаўнікам у вёску Пінкавічы, калі Расійская імперыя ўвайшла ў грамадска-палітычную турбулентнасць. Рэвалюцыйныя падзеі 1905 года ў сталіцы царскай Расіі дакаціліся і да Піншчыны [9]. Яны вельмі ўскалыхнулі ціхае быццё пінчукоў, акунулі ў вір палітычнага жыцця.

У лістападзе 1905 года Колас дапамог мясцовым сялянам скласці петыцыю (патрабаванні) на імя памешчыка Сігізмунда Скірмунта [7, с. 16], за што ў студзені 1906 года быў затрыманы паліцыяй. У якасьці пакарання яго перавялі ў Верхменскае народнае вучылішча Ігуменскага павета Мінскай губерні.

У петыцыі, якую са слоў сялян склаў Якуб Колас не было аніякіх заклікаў да бунту. Наадварот, можна смела сказаць, што зварот цалкам дыпламатычны, стрыманы і канкрэтны. Нават у ходзе разбіральніцтва справы інспектар народных вучылішч Пінскага павета адзначыў, што настаўнік у петыцыі рашуча настойваў на тым, каб непаразуменне было ўладжана мірным шляхам. Але ж вялікую ролю адыграў агульны фон – разгаралася першая руская рэвалюцыя, паўсюдна страйкавалі рабочыя, набіраў моц сялянскі рух, а месцамі па імперыі ўспыхвалі паўстанні. У такой сітуацыі любая размова пра правы сялян, памешчыкамі і прадстаўнікамі царскай улады ўспрымалася адназначна, як бунт ці яго праява. Разам з тым, верагодна ўсё ж адказныя чыноўнікі разумелі, што ўчынак Якуба Коласа сапраўды не радыкальны і таму пакаралі пераводам у іншае месца працы, а не зняволеннем.

Знаходзячыся ў Пінкавічах Канстанцін Міхайлавіч напісаў каля 20 вершаў, якія ўвайшлі ў першы том акадэмічнага выдання ў 14-ці тамах [7, с. 19]. Рукапісы гэтых вершаў былі канфіскаваны ў 1905 годзе пры арышце Якуба Коласа ў Пінкавічах. Сам аўтар лічыў, што яны загінулі, але значна пазней былі знойдзены і зараз захоўваюцца ў рукапісным аддзеле бібліятэкі Акадэміі Навук Літвы. Па просьбе пінкавіцкага музея супрацоўнікі бібліятэкі прыслалі ксеракопіі некаторых вершаў Якуба Коласа. Яны сталі каштоўнымі экспанатамі літаратурна-краязнаўчага музея народнага паэта ў Пінкавічах.

З высылкай у студзені 1906 года сувязь Якуба Коласа з Піншчынай не скончылася, быў яшчэ адзіны «пінскі перыяд» у жыцці класіка. Восенню 1911 года Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч адбыў тэрмін турэмнага зняволення – ў 1908 годзе [10, с. 161] ён атрымаў тры гады пазбаўлення волі па абвінавачванні ў ажыццяўленні праграмы Усерасійскага саюза настаўнікаў, якая, на думку ўладаў, падрывала грамадскі лад Расійскай імперыі. Пасля вызвалення Колас настойліва шукаў работу [7, с. 23]. Але, каб атрымаць пасаду ў сістэме адукацыі, патрэбна было мець пасведчанне аб «благанадзейнасці», у чым палітычнаму вязню неаднаразова адмаўлялі [7, с. 23]. Большасць аднагрупнікаў па настаўніцкай семінарыі, былых калег і знаёмых наўпрост баяліся неяк дапамагаць настаўніку-рэвалюцыянеру. Толькі адзіны тады таварыш па семінарыі Вікенцій Філіповіч [10, с. 161] запрасіў яго да сябе ў Лунінец, дзе ён жыў зіму і зарабляў на пражыццё прыватнымі ўрокамі.

«Філіповіч, мой таварыш па класу, мала таго – сядзелі на адной лаўцы, паклікаў да сябе ў Лунінец. Добрая душа! Передаў мне сваіх вучняў, дзяцей чыгуначнікаў. Я пачаў рэпеціраваць іх. Плата слабаватая: два рублі на месяц з галавы. Добра, калі галава кемлівая, а ў другую і табліцу множання калом не ўб’еш. Нават у Люсіне плацілі на рубель больш. У Філіповічавым пакоі зрабіў я школку. Займалася ў мяне 20 чалавек» [8, с. 164].

У гэты час К.М. Міцкевіч многа працуе творамі. Ён напісаў апавяданні «Як Янка разбагацеў», «Старасць не радасць», вершы, працаваў над паэмай «Новая зямля», пачаў пісаць паэму «Сымон-музыка» [8, с. 164]. Увогуле стварыў шмат вершаў і апавяданняў. Творчасць адцягвала яго ўвагу ад цяжкіх думак і разважанняў наконт няпэўнасці свайго становішча.

Творчы ўздым быў звязаны з тым, што ў зняволенні Якуб Колас засумаваў па літаратурнай творчасці. Меў даволі шмат вольнага часу. Верагодна, што само з'яўленне Коласа ў Лунінцы не было выпадковым, бо ён імкнуўся быць як мага бліжэй да сваёй каханай – Марыі Дзмітрыеўны Каменскай. Яна працавала ў Пінску настаўніцай у чыгуначнай царкоўна-прыходскай школе [8, с. 164].

У маі 1912 года К.М. Міцкевіч урэшце атрымаў «свидетельство о благонадежности» [10, с. 161] . У гэтай справе яму вельмі дапамог даўні знаёмы і заступнік, інспектар пінскіх гарадскіх вучылішчаў Рыгор Антонавіч Русецкі [8, с. 164]. Спачатку Коласа накіравалі на работу ў школу ў вёску Купяцічы Пінскага павета [4, с. 102], але з 1 верасня 1912 года ён стаў працаваць малодшым настаўнікам у Пінскім трэцім прыхадскім двухкласным мужчынскім вучылішчы, якое тады знаходзілася на вуліцы Брэсцкай побач з запалкавай фабрыкай. Праз год Колас перайшоў выкладаць ужо ў другое гарадское прыходскае вучылішча пры станцыі Пінск Палескай чыгункі. Будынак былога вучылішча захаваўся да нашых дзён [10, с. 162].

Пінскі перыяд быў важнай старонкай у біяграфіі пісьменніка. Шмат перамен да лепшага адбылося ў яго асабістым і творчым жыцці.

Па-першае, атрымаў работу і стварыў сям'ю. Ажаніўся са сваёй каханай, маладой настаўніцай Марыяй Дзмітраўнай Каменскай. Яна стане вернай спадарожніцай жыцця пісьменніка [8, с. 166]. Вясной 1913 года Канстанцін Міхайлавіч зрабіў ёй прапанову, папрасіў у лісце да маці бацькоўскага благаславення на шлюб з Марыяй Дзмітрыеўнай. Вянчаліся маладыя ў Пінску 3 чэрвеня 1913 года [10, с. 162]. У памяць аб падзеі ў ліпені 2015 года на двухяруснай званіцы перад Варварынскай царквой з'явілася мемарыяльная дошка, якая інфармуе пра важны факт асабістага жыцця класіка беларускай літаратуры [11]. «Вяселля не гулялі, толькі выпілі пляшку данскога віна. Было затое шлюбнае падарожжа» [8, с. 166]. Маладая сям'я жыла ў доме чыгуначнага фельчара Арсенія Балевіча на вуліцы Вадаправоднай [10, с. 162]. Гэты дом знаходзіўся на заходняй ускраіне горада каля маёнтка Гай. Ён захаваўся да нашых дзён, але па іншым адрасе, цяпер гэта вуліца Чуклая, 63 і дом вельмі прыкметны: вокны з аканіцамі, вакол высокія старыя елкі, а на сцяне – мемарыяльная дошка, з надпісам: «Тут, у 1912–1915 гг. жыў народны паэт Беларусі Якуб Колас» [4, с. 104]. У Пінску, 30 верасня 1914 года, нарадзіўся сын Даніла [12]. У будучыні Данііл Канстанцінавіч Міцкевіч стане Заслужаным дзеячам культуры Беларускай ССР і створыць у Мінску Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей у гонар свайго выбітнага бацькі.

Нельга пакінуць без увагі той момант, што Колас займеў добрыя стасункі з сям'ёй Балевічаў [13]. Гэта, як найменей, сведчыць пра камунікатыўныя здольнасці настаўніка К.М. Міцкевіча. Ён зусім не выпадкова летам 1912 года, зняў пакой з невялікай кухняй менавіта ў доме фельчара чыгуначнай станцыі Пінск, калежскага рэгістратара Арсенія Аляксандравіча Балевіча. Раней сюды засялілася каханая М.Д. Каменская. Абавязвала і новая пасада – настаўнік у вучылішчы. Безумоўна, месца жыхарства адбівалася на ўзаемаадносінах начальства і калег з «нядобранадзейным» аўтарам беларускамоўных выданняў. Балевічы лічыліся ў Пінску адной з прыстойных сем'яў сярод гарадской праслойкі дзяржаўных службоўцаў, медыкаў, педагогаў. Цяжка сказаць, ці быў пасвечаны ў літаратурнае падзвіжніцтва свайго пастаяльца А.А. Балевіч, ці ведаў, што Канстанцін Міхайлавіч у студзені 1906 года за рэвалюцыйную прапаганду сярод сялян вёскі Пінкавічы пераведзены ў іншае месца, а потым тры гады сядзеў у турме за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе. Але можна меркаваць, што здагадваўся:

карэспандэнцыя, якая прыходзіла з Вільні ад беларускамоўнага выдання, казала сама за сябе [10, с. 162]. Аднак Арсень Аляксандравіч не лічыў патрэбным і магчымым для сябе цікавіцца асабістымі справамі Канстанціна Міхайлавіча, з'яўляючыся прытым чалавекам строгіх афіцыйных поглядаў, заняты сям'ёй і працай.

Пасля пінскага перыяду лёс ізноў звёў К.М. Міцкевіча з сям'ёй Балевічаў па завяршэнні Вялікай Айчыннай вайны [13]. У жніўні 1944 года, сын Арсенія Аляксандравіча, Карнэлій Балевіч быў арыштаваны гарадскімі органамі НКУС і асуджаны на пяць гадоў пазбаўлення волі. Затым была высылка ў Краснаярскі край. Карнэлій звярнуўся па дапамогу да Коласа, які тады ў дадатак да ўсяго з'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР і СССР. Народны паэт адгукнуўся на просьбу аб дапамозе, але, на жаль, паўплываць на вызваленне або змякчэнне пакарання не змог [13]. У далейшым жа кантакты паміж Міцкевічамі і Балевічамі працягваліся яшчэ доўгі час. Сын Якуба Коласа Данііл Канстанцінавіч не раз наведваў дом, у якім нарадзіўся і зрабіў першыя крокі. Карнэлій Арсеньевіч праз некалькі гадоў пасля вызвалення гасцяваў у Міцкевічаў у Мінску.

Па-другое, 1912–1914 гады – самы плённы перыяд дарэвалюцыйнай творчасці Якуба Коласа. Мастак слова працаваў над творамі, якія прынеслі вядомасць. Напісаў больш дзесяці знакавых апавяданняў, каля дваццаці вершаў. Сярод іх такія творы як «Нёманаў дар», «У старых дубах», «Малады дубок», «Будзь цвёрдым». Адначасова працягваў работу над паэмамі «Новая зямля» і «Сымон-музыка» [10, с. 162]. У 1912 годзе выйшла першая празаічная кніга «Апавяданні», а ў 1914 годзе – «Родныя з'явы», пасля чаго Якуб Колас стаў вядомым не толькі як паэт, але і як празаік. У творах таго часу пісьменнік глыбока адлюстроўвае класавыя і сацыяльныя кантрасты беларускай рэчаіснасці і выносіць ёй прыгавор. Ён верыць у перамогу народа, заве працоўных змагацца за сваю долю.

«Пінскі перыяд быў плённы для Якуба Коласа. У гэты час на паперу лягло і было апублікавана шмат вершаў. Яны вызначаюцца тэматычнай і жанравай разнастайнасцю. Значнае месца займаюць творы, у якіх раскрываецца неўладкаванасць жыцця беларуса, што спараджае адпаведны настрой лірычнага героя» [8, с. 166].

І гэта пры тым, што насамрэч часу на творчасць было вельмі мала: даводзілася шмат працаваць у вучылішчы, займацца рэпетытарствам, ды і сямейных клопатаў дадалося – нарадзіўся сын.

Адбывалася шмат розных сустрэч з цікавымі людзьмі. Прыходзілі калегі-настаўнікі, аднадумцы. Чыталі кнігі, спрачаліся паміж сабой, бо час быў не з лёгкіх. Адбываліся істотныя пераўтварэнні ў грамадска-палітычным жыцці, па трохі пашыраўся нацыянальны рух, развівалася беларуская культура, літаратура, мастацтва.

У Пінску Колас меў блізкае атачэнне, каму давяраў і хто яму дапамагаў у складаную гадзіну [8, с. 164-166]: гэта настаўнік Вікенцій Антонавіч Філіповіч, які спачатку працаваў у Лунінцы, а затым у Пінску; інспектар гарадскіх вучылішчаў Пінска Рыгор Антонавіч Русецкі; старшы настаўнік Пінскага другога прыходскага вучылішча Адам Іванавіч Абадоўскі; выкладчык нямецкай мовы Пінскага рэальнага вучылішча Эдмунд Зуземіль. Дарэчы, з В.А. Філіповічам паэт сустракаўся ў 1920-я гады ў Мінску. Падтрымоўваў Колас сувязь і з сям'ёй Абадоўскіх [14]. Яго старэйшы калега па пінскім вучылішчы Адам Іванавіч памёр на пачатку 1920-х гадоў, але паэт у 1940-м годзе перапісваўся з яго сынам Мікалаем. На той час Абадоўскі-малодшы быў дырэктарам новаўтворанай рускамоўнай школы ў г.Століне. Колас дапамог яму са стварэннем школьнай бібліятэкі – перадаў у дар кнігі [14].

Многія задумкі паэт не змог закончыць у горадзе над Пінай – пачалася Першая Сусветная вайна [15]. У 1914 годзе яго забралі на вайсковую службу. Потым Міцкевіч на некалькі месяцаў вяртаўся ў Пінск і ў 1915 годзе разам з сям'ёю эвакуяваўся ў глыб Расійскай імперыі. 15 верасня 1915 года, на тры гады, Пінск быў акупаваны кайзераўскімі войскамі.

Фізічная сувязь песняра беларускага народа з Піншчынай спынілася. Але ў сваіх думках Якуб Колас не раз вяртаўся сюды, напісаў аповесці «У палескай глушы» і «У

глыбі Палесся» [3, с. 17]. У свае мастацкія творы ўзяў краявіды Пінкавіч, атмасферу Пінска. Героямі яго аповесцяў сталі рэальныя пінчукі, з якіх спісаў характар, рысы, паводзіны. Сюжэты яго твораў маюць пад сабой рэальныя падзеі і лёсы людзей, якія адбыліся і якіх назіраў на Піншчыне.

Сваю любоў да гэтага краю і сум па ім ён выказаў у вершы «Палессе», які напісаў у 1916 годзе знаходзячыся ў эвакуацыі ў Пермі [15].

Я далёка цяпер
Ад палескіх раўнін,
А люблю ж я той край, Бо яго родны сын,
І па ім маё сэрца баліць… [15]

**Заключэнне.** Не забыліся і ў Пінску, што ў біяграфіі класіка айчыннай літаратуры ёсць старонкі звязаныя з Пінскім краем. У другой палове XX стагоддзя ў горадзе над Пінай зрабілі некалькі захадаў, каб годна ўшанаваць памяць пра гэты факт.

У 1952 годзе [4, с. 104] на будынку былога Пінскага другога прыхадскога вучылішча, ў нашыя дні вул. Чыгуначная, 25, дзе выкладаў Якуб Колас, усталявалі мемарыяльную дошку ў гонар славутай постаці нацыянальнай культуры.

Своеасаблівым помнікам прыбыцця беларускага Песняра на Піншчыне, стала тое, што ў 1960–1961 гадах рэжысёр Уладзімір Уладзіміравіч Корш-Саблін здымаў у Пінску гісторыка-рэвалюцыйны кінараман «Першыя выпрабаванні» па трылогіі Якуба Коласа «На росстанях» [16]. Гістарычны цэнтр неафіцыйнай сталіцы Беларускага Палесся стаў здымачнай пляцоўкай кінастужкі. Гэта не выпадкова, бо Колас жа перанёс у свой мастацкі твор навакольныя мясціны, краявіды і постаці, але змяніўшы геаграфічныя назвы і імёны. Галоўныя ролі адыгралі: малады настаўнік Андрэй Лабановіч – акцёр тэатра і кіно Эдуард Ізотаў [16], дачка ляснічага Ядвіся – актрыса Тэатр-студыі кінаакцёра Наталля Кусцінская [16], рэвалюцыянерка Вольга Андросава – актрыса Пермскага тэатра драмы Алена Карнілава [16], а вобраз памешчыка Сігізмунда Скірмунта з маёнтка Альбрэхтова ўвасобіў заслужаны артыст РСФСР, лаўрэат трох Сталінскіх прэмій МіхаілНазванаў [16]. Двухсерыйны кінараман па трылогіі «На росстанях», са сцэнамі знятымі ў старым Пінску, прагледзела звыш 27 мільёнаў гледачоў СССР.

У Пінску, ўвосень 1962 года, на доме Балевічаў, дзе жыў Якуб Колас са сваёй сям’ёй, устанавілі мемарыяльную дошку з адпаведным надпісам [4, с. 104].

22 студзеня 1991 года Савет Міністраў Беларускай ССР пастанавіў прысвоіць імя народнага паэта Якуба Коласа Пінскай цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэцы.

31 жніўня 1996 года Пінск наведала сям’я сына Якуба Коласа Данілы Канстанцінавіча Міцкевіча [12]. Прытрымліваючыся яго перадсмяротнай просьбе, частка крэміраваных астанкаў была развеяна над пінскай зямлёй – радзімай памерлага. Уражэнец Пінска, заслужаны дзеяч культуры БССР Д.К. Міцкевіч памёр 7 ліпеня 1996 года. Па ягоным завяшчаньні прах павінны былі развеяць каля магіл бацькі (Якуба Коласа) і маці (М.Д. Каменскай) на могілках у беларускай сталіцы і блізкія людзі мусілі развезці па мясцінах, у якіх даводзілася жыць, бываць і якія спадабаліся Даніілу Канстанцінавічу. Гэта Мінск, Мікалаеўшчына ў Стаўбцоўскім раёне, дзе са старажытных часоў існаваў род Міцкевічаў, Санкт-Пецярбург, Масква, Ташкент і Пінск. Тады горад над Пінай з важнай місіяй наведалі: ўдава Данілы Канстанцінавіча Аляўціна Цімафееўна, ягоная дачка Вера Данілаўна і праўнучка Коласа Валянціна [12]. Яны развеялі частку крэміраваных астанкаў сына Коласа каля дома Балевічаў (вул. Чуклая, 63 – былая Вадаправодная), дзе ў 1912–1915 гадах кватэраваўся пісьменнік з сям’ёй.

У Музеі Беларускага Палесся захоўваюцца дзясяткі экспанатаў звязаных з жыццём і творчасцю выбітнага пісьменніка [2]. Сярод якіх – кніга «У палескай глушы» з аўтографам аўтара, якую ён 7 красавіка 1956 года перадаў у Пінскі краязнаўчы музей [2], цяпер Музей Беларускага Палесся. Пісьмо Якуба Коласа жыхарам вёскі Пінкавічы, датаванае 1952 годам, з запрашэннем прыехаць на святкаванне 70-годдзя [17]. Рарытэтная кушэтка з дома Балевічаў. Кій, які належыў паэту.

З 2021 года, штогод у лістападзе, на базе Пінскай гарадской дзіцячай бібліятэцы імя Якуба Коласа праходзіць Міжрэгіянальная навукова-практычная канферэнцыя прысвечаная папулярызацыі біяграфіі і творчай спадчыны народнага паэта [18]. Штогод канферэнцыя мае канкрэтную тэму, напрыклад, у 2023 годзе яна мела назву «Коласаўскія адрасы радзімы: памятныя месцы, музеі, помнікі», а ў 2025 годзе «Вечнасць праз слова: літаратурная спадчына Якуба Коласа» [19]. Удзел у навукова-асветніцкім мерапрыемстве прымаюць даследчыкі спадчыны Коласа з Мінска, Брэста, Лунінца, музейныя работнікі з Пінска, краязнаўцы, настаўнікі роднай мовы і літаратары, святары праваслаўнай епархіі, вучні мясцовых школ і каледжаў. Усе яны разам, робяць шмат, каб дакрануцца да невычэрпных крыніц творчасці слыннага дзеяча беларускай літаратуры, пагартаць старонкі яго жыцця, ў тым ліку звязаныя з Піншчынай.

У Пінскім краі захоўваюць памяць аб Якубе Коласе. Імя славутай постаці ўшанавана ў шыльдах, назвах вуліц і ўстаноў, даследуецца і папулярызуецца праз арганізацыю шматлікіх мерапрыемстваў.

Якуб Колас, узяўшы вобразы Піншчыны і пінчукоў у свае творы, на доўгія стагоддзі праславіў гэты цудоўны край, аддаў павагу яго працавітым і добрым жыхарам. І такую ўдзячнасць з боку класіка айчыннай літаратуры магчыма зразумець. Пінскі край адыграў важную ролю ў фармаванні Коласа, як творца, так і грамадзяніна. Сапраўды на Піншчыну прыехаў малады настаўнік, а пакідаў яе ўжо вядомы пісьменнік з вялікай перспектывай.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб прысваенні імя Народнага паэта Беларускай ССР Якуба Коласа Пінкавіцкай сярэдняй школе Пінскага раёна Пінскай вобласці і Нясвіжскай педагагічнай вучэльні Баранавіцкай вобласці»// Бягучы архіў Народнага літаратурна-краязнаўчага музея Якуба Коласа ў в. Пінкавічы (БАНЛКМП). – 30.10.1952. – 1 арк. Копія.
2. Ильенков, В. Вслух читаем Коласа, или Как в Пинске отмечают юбилей книги белорусского классика / В. Ильенков // Пінскі веснік. – URL: https://p–v.by/news/culture/vsluh–chitaem–kolasa–ili–kak–v–pinske–otmechayut–yubilej–knigi–belorusskogo–klassika. – Дата публ.: 18.03.2026.
3. Лозицкий, А. И. В поход по Пинщине / А. И. Лозицкий, Ф. Ф. Журавский, В. В. Боровиков. – Пинск: Пинская городская типография, 1958. – 56 с.
4. Макавчук, В. Н. Путеводитель по столице Полесья / В. Н. Макавчук. – Пинск: Пинская городская типография, 1993. – 375 с.
5. План дзейнасці Савета музея і літаратурнага гуртка «Веснавыя ручайкі» на 1980/1981 навучальны год // БАНЛКМП. – верасень 1980. – 3 арк. Арыгінал.
6. Кісель, Д. Чалавек і настаўнік з вялікай літары / Д. Кісель // Пінскі веснік + Полесская правда. – 2024. – 20 вер. – С. 15.
7. Калоша, І.І. Пінкавічы і Вішавічы: мінулае і сучаснае / І.І. Калоша. – Пінск: Пінская рэгіянальная друкарня, 2020. – 172 с.
8. Ильин, А.Л. Очерки истории культуры Пинщины (IX – нач. XX вв.): монография / А.Л. Ильин, Е.А. Игнатюк. – Пинск: ПолесГУ, 2013. – 220 с.
9. Калоша, І. І. Якуб Колас – настаўнік / І.І. Калоша // Учитель вечен на земле Полесской / сост. И.Кибак. – М., 2005. – С. 8.
10. Памяць. Пінскі раён / Г. К. Киселёв, Ф. П. Корольчук, Д. Г. Лемешевский, В. В. Сашко [и др.]. – Мн.: БЕЛТА, 2003. – 621 с.
11. Уладзімірава, Г. Пінчукі захоўваюць память пра Песняра: [на званіцы Свята–Варварынскага сабору адкрыта мемарыяльная дошка ў памяць аб вянчанні К. М. Міцкевіча (Якуба Коласа) і М. Д. Каменскай] / Г. Уладзімірава // Полесская правда. – 2015. – 29 июл. – С. 3.
12. Ильенков, В. На родине мужа и отца: [Пинск посетила семья сына Я. Коласа Данилы Константиновича Мицкевича] / В. Ильенков // Пінскі веснік. – 1996. – 3 вер. – С. 3.

13. Ильенков, В. С Новым годом поздравляет Колас: Новогодняя открытка, подписанная Якубом Коласом / В. Ильенков // Пінскі веснік. – 2012. – 28 снеж. – С. 12.
14. Кисель, Д. Справлялся с любой задачей, какой бы трудной она ни была / Д. Кисель // Пінскі веснік + Полесская правда. – 2024. – 3 мая. – С. 8–9.
15. Богнат, Г. Пінкавіцкія сцяжынкі Якуба Коласа: [да 130-годдзя Якуба Коласа] / Г. Богнат // Полесская правда. – 2012. – 3 ноя. – С. 2.
16. Пинск: какие фильмы снимались: [сайт]. – 2006-2025. – URL: https://www.kino–teatr.ru/geo/city/3425/movie/ (дата звароту: 18.03.2026).
17. Пісьмо Якуба Коласа вучням Пінкавіцкай сярэдняй школы Пінскага раёна // БАНЛКМП. – 03.11.1952. – 1 арк. Копія.
18. Папіціч, Л. Якуба песні – дзіўны дар / Л. Папіціч // Пінскі веснік. – 2022. – 18 ліст. – С. 9.
19. Пинская городская централизованная библиотечная система: [сайт]. – 2016–2025. – URL: https://pinsklib.by/2025/11/12/v–mezhregionalnaya–nauchno–prakticheskaya–konferentsiya/ (дата звароту: 18. 03.2026).

**References**

1. *Ukaz Prezidyuma Vyarhounaga Saveta BSSR «Ab prysvaenni imya Narodnaga paeta Belaruskaj SSR Yakuba Kolasa Pinkavickaj syarednyaj shkole Pinskaga rayona Pinskaj voblasci i Nyasvizhskaj pedagagichnaj vuchel'ni Baranavickaj voblasci»* [Decree of the Presidium of the Supreme Soviet of the BSSR "On naming the People's Poet of the Belarusian SSR Yakub Kolas to the Pinkavichy Secondary School of the Pinsk District of the Pinsk Region and the Nesvizh Pedagogical College of the Baranavichy Region"]. Current Archive of the Yakuba Kolasa National Literary and Local History Museum in the village of Pinkavichy (CANLHM). October 30, 1952. 1 sheet. Copy.
2. Il'enkov, V. *Vsluh chitaem Kolasa, ili Kak v Pinske otmechayut yubilej knigi belorusskogo klassika* [Reading Kolas aloud, or How Pinsk is celebrating the anniversary of the Belarusian classic's book] (In Russian). Available at: https://p–v.by/news/culture/vsluh–chitaem–kolasa–ili–kak–v–pinske–otmechayut–yubilej–knigi–belorusskogo–klassika (accessed: 18.03.2026).
3. Lozickij A.I., Zhuravskij F.F., Borovikov V.V. *V pohod po Pinshchine* [In the hike through Pinsk region]. Pinsk city printing house, 1958. 56 p. (In Russian)
4. Makavchuk, V.N. *Putevoditel' po stolice Poles'ya* [A guide to the capital of Polesia]. Pinsk city printing house, 1993. 375 p. (In Russian)
5. *Plan dzejnasci Saveta muzeya i litaraturnaga gurtka «Vesnavyya ruchajki» na 1980/1981 navuchal'ny god* [Plan of activities of the Museum Council and the literary circle "Spring Streams" for the 1980/1981 academic year]. CANLHM. September 1980. 3 sheets. Original.
6. Kisel', D. *Chalavek i nastaunik z vyalikaj litary* [Man and teacher with a capital letter]. *Pinski vesnik + Polesskaya pravda* [Pinsk Herald + Polesskaya Pravda], 2024, 20 Sep, p. 15 (In Belarusian)
7. Kalosha, I.I. *Pinkavichy i Vishavichy: minulae i suchasnae* [Pinkavichy and Vishavichy: Past and Present]. Pinsk city printing house, 2020. 172 p. (In Belarusian).
8. Il'in, A.L., Ignatyuk E.A. *Ocherki istorii kul'tury Pinshchiny (IX – nach. XX vv.)* [Essays on the cultural history of Pinsk region (9th – early 20th centuries)]. Pinsk, PolesGU, 2013, 220 p. (In Russian)
9. Kalosha, I.I. *Yakub Kolas – nastaunik* [Jakub Kolas – teacher]. *Uchitel' vechen na zemle Polesskoj* [The teacher is eternal on the Polesie land]. Minsk, 2005, p. 8. (In Belarusian)
10. Kiselyov G.K., Korol'chuk F.P., Lemeshevskij D.G., Sashko V.V. *Pamyac'. Pinski rayon* [Memory. Pinsk district]. Minsk, BELTA, 2003, 623 p. (In Russian)
11. Uladzimirava, G. *Pinchuki zahouvayuc' pamyat' pra Pesnyara* [The Pinchuks keep the memory of Pesnyar alive]. *Polesskaya Pravda* [Polesskaya Pravda], 2015, July 29, p. 3 (In Belarusian)
12. Il'enkov, V. *Na rodine muzha i otca* [In the homeland of my husband and father]. *Pinski vesnik* [Pinsk Herald], 1996, 3 Sep, p. 3 (In Russian)

13. Il'enkov, V. *S Novym godom pozdravlyaet Kolas: Novogodnyaya otkrytka, podpisannaya Yakubom Kolasom* [Happy New Year from Kolas: A New Year's card signed by Yakub Kolas]. *Pinski vesnik* [Pinsk Herald], 2012, December 28, p. 12 (In Russian)
14. Kisel', D. *Spravlyalsya s lyuboj zadachej, kakoj by trudnoj ona ni byla* [He coped with any task, no matter how difficult it was]. *Pinski vesnik + Polesskaya pravda* [Pinsk Herald + Polesskaya Pravda], 2024, May 3, pp. 8-9 (In Russian)
15. Bognat, G. *Pinkavickiya scyazhynki Yakuba Kolasa* [Pinkavichy paths of Yakub Kolas]. *Polesskaya Pravda* [Polesskaya Pravda], 2012, November 3, p. 2 (In Belarusian).
16. *Pinsk: kakie fil'my snimalis'* [Pinsk: what films were filmed there]. (In Russian). Available at: https://www.kino–teatr.ru/geo/city/3425/movie/ (accessed: 18.03.2026).
17. *Pis'mo Yakuba Kolasa vuchnyam Pinkavickaj syarednyaj shkoly Pinskaga rayona* [A letter from Yakub Kolas to students of Pinkavichy Secondary School, Pinsk District]. CANLHM. 03.11.1952. 1 sheet. A copy.
18. Papicich, L. *Yakuba pesni – dziuny dar* [Yakub's songs are a strange gift]. *Pinski vesnik* [Pinsk Herald], 2022, November 18, p. 9 (In Belarusian)
19. *Pinskaya gorodskaya centralizovannaya bibliotechnaya Sistema* [Pinsk city centralized library system]. (In Russian). Available at: https://pinsklib.by/2025/11/12/v–mezhregionalnaya–nauchno–prakticheskaya–konferentsiya/ (accessed: 18.03.2026).

*Received 7.04.2026*